PolotskSU



## *ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ І СУМЕЖНЫХ ТЭРЫТОРЫЙ*

УДК 94 (476)«1924»

# АФАРМЛЕННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ МЯЖЫ БССР НА ПОЛАЦКА-СЕБЕЖСКІМ УЧАСТКУ (КРАСАВІК – МАЙ 1924 г.)

**Бараноўскі А.В.**
Рэспубліка Беларусь, Мінск

*У артыкуле на падставе архіўных матэрыялаў разглядаецца працэс афармлення дзяржаўнай мяжы БССР на полацка-себежскім участку.*
***Ключавыя словы:*** *паўночна-ўсходняя дзяржаўная мяжа БССР, Віцебская губерня, Пскоўская губерня, Полацкі павет, Себежскі павет.*

Пытанне аб вызначэнні дзяржаўнай мяжы паміж БССР і РСФСР на віцебска-пскоўскім памежжы паўстала адразу пасля таго, як стала зразумела, што Веліжскі, Невельскі і Себежскі паветы Віцебскай губерні застаюцца ў складзе РСФСР і далучаюцца да Пскоўскай губерні. Правядзенне дадзенай мяжы абмяркоўвалася як на павятовым, так і на губернскім узроўнях. Так, напрыклад, 21 сакавіка 1924 г. прэзідыум Себежскага павятовага выканкама, заслухаўшы даклад аб вызначэнні дзяржаўнай мяжы паміж Себежскім паветам і БССР, пастанавіў лічыць мэтазгодным усталяваць наступную мяжу: ад мяжы Латвіі каля вёсак Даманава, Малеўшчына, Красава, Лобасна, Руткевіч, Кабыліна, Страднае, па рацэ Свольна да зліцця з ручаём Шахоўка, далей па ручаю Шахоўка, па Чорнаму возеру ў паўднёва-заходні кут Чарапеціцкага возера супраць в. Ванькава ў кут мяжы з Полацкім паветам. У падмурак вызначэння дадзенай мяжы лягло эканамічнае прыцягненне насельніцтва паўночнай часткі былога Дрысенскага павета да Себежа [1, арк. 226].

Непасрэдна вызначэннем мяжы, як і перадачай Веліжскага, Невельскага і Себежскага паветаў у склад Пскоўскай губерні, займалася Беларуска-Пскоўская пагаджальная камісія. Дзяржаўная мяжа праводзілася асобна на трох участках, кожны з іх адпавядаў мяжы Веліжскага, Невельскага і Себежскага паветаў з тэрыторыяй, вернутай у склад БССР. У дадзеным артыкуле пойдзе гаворка непасрэдна пра афармленне мяжы на на полацка-себежскім участку.

Першае пасяджэнне пагаджальнай камісіі адбылося 2 красавіка 1924 г. На ім беларускі бок прапаноўваў за аснову дзяржаўнай мяжы ўзяць мяжу, што існавала ў 1920 г. паміж Веліжскім, Невельскім і Себежскім паветамі з аднаго боку і астатнімі паветамі Віцебскай губерні з другога, дапускаючы папраўкі ў той ці іншы бок у залежнасці ад эканамічных, адміністрацыйных і іншых прыкмет. У сваю чаргу, пскоўскі бок прапаноўваў правесці мяжу на падставе адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення Віцебскай губерні, якое ўзнікла падчас апошняга ўнутрыгубернскага раянавання, дапускаючы адхіленні на тых жа падставах у той ці іншы бок.

Падчас абмеркавання дадзеных прапаноў прадстаўнік Себежскага павятовага выканкама Малашонак выказаўся аб захаванні часткі тэрыторыі былога Дрысенскага павета ў складзе Себежскага павета. Заслухаўшы прапановы наконт вызначэння адміністрацыйнай мяжы і прыведзеныя вышэй меркаванні па гэтым пытанні, пагаджальная камісія вырашыла пасяджэнне завяршыць. Да наступнага разу прадстаўнікі БССР і Пскоўскай губерні павінны былі падрыхтаваць абгрунтаваныя праекты межаў, улічваючы эканамічныя і іншыя прыкметы [2, арк. 45–47].

Другое пасяджэнне пагаджальнай камісіі пачалося 3 красавіка 1924 г. На ім былі агучаны праекты правядзення дзяржаўнай мяжы паміж БССР і РСФСР на трох участках. Пскоўская камісія лічыла неабходным пры перадачы Себежскага павета (па старым адміністрацыйным дзяленні) захаваць у яго складзе Асвейскую, а таксама частку Нішчанскай валасцей. Вылучэнне дадзенай тэрыторыі са складу павета, на думку членаў камісіі, магло вельмі цяжка адбіцца на эканамічным дабрабыце Себежскага павета. Таксама гэта было вельмі важна для ажыццяўлення адзінага кіраўніцтва аховай дзяржаўнай мяжы з Латвійскай Рэспублікай. Беларуская камісія лічыла, што дзяржаўная мяжа БССР з Себежскім паветам павінна была прайсці згодна пастанове УЦВК, гэта значыць без усялякіх змен. Члены Беларускай камісіі адзначалі, што, на падставе даных перапісаў 1897 г. і 1920 г., на тэрыторыі былога Дрысенскага павета пераважала беларускае насельніцтва. Меркаванні пскоўскага боку адносна захавання Асвейскай і часткі Нішчанскай валасцей у раянаванні 1923 г. у складзе Себежскага павета па матывах зручнасці аховы мяжы, на думку беларускага боку, не вытрымлівалі ніякай крытыкі, паколькі ахова межаў складала прэрагатыву СССР, а не асобных рэспублік, якія ўваходзяць у яго склад. Пасля працяглых абмеркаванняў дадзеных праектаў было вырашана пасяджэнне завяршыць. Да наступнага разу камісіям было неабходна прадставіць сваё канчатковае меркаванне адносна фарміравання дзяржаўнай мяжы [2, арк. 52–55].

Найбольш плённым было чацвёртае пасяджэнне пагаджальнай камісіі, якое адбылося 5 красавіка. Пасля працяглага абмену думкамі пытанне перадачы паветаў і правядзення дзяржаўнай мяжы на віцебска-веліжскім і віцебска-невельскім участках было вырашана. Дзяржаўная мяжа на віцебска-веліжскім участку вызначалася па карце адміністрацыйнага дзялення Віцебскай губерні за 1920 г. У склад Пскоўскай губерні перадаваліся ўсе валасці павета, за выключэннем тых, што раней складалі Суражскі павет, далучаны да БССР. Дзяржаўная мяжа на віцебска-невельскім участку вызначалася па той жа карце, прычым валасці ліквідаванага ў 1923 г. Гарадоцкага павета – Горкаўская, Руднянская, Старынская, Халамерская і Обальская, далучаліся да БССР. Дубакрайская і Стайкаўская валасці заставаліся ў складзе Невельскага павета [2, арк. 58–61].

Пры вызначэнні дзяржаўнай мяжы на полацка-себежскім участку ўзніклі спрэчкі, якія канчаткова вырашаны не былі. Беларускі бок не пагадзіўся з рашэннем пакінуць у складзе Себежскага павета Асвейскую валасць і Юхавіцкі райсавет Ленінскай валасці, на чым настойваў пскоўскі бок. Прадстаўнікі БССР, адстойваючы межы 1920 г., указвалі на адсутнасць эканамічных сувязяў Асвейскай валасці з Себежам і цягай апошняй да Полацка, а таксама перавагай сярод насельніцтва беларускага элемента. Пскоўскія прадстаўнікі прыводзілі наступныя довады. Па-першае, з моманту арганізацыі аховы мяжы ўчастак, да якога прылягала Асвейская валасць, заўсёды ахоўваўся з Себежскага цэнтра. Па-другое, назіралася прыцягненне насельніцтва Асвейскай валасці да Себежа. Пры неабходнасці паехаць у Віцебск, асвейскае насельніцтва ездзіла абавязкова праз Себеж, а не праз Дрысу-Полацк. Па-трэцяе, беларускае насельніцтва ў Асвейскай валасці не пераважала, яно мінімальнае

PolotskSU



і згрупавана ля самай мяжы па тракце Дрыса-Люцын. У сувязі з разыходжаннем бакоў адносна фарміравання дзяржаўнай мяжы для Себежскага павета дадзенае пытанне было перададзена на вырашэнне арбітражнай камісіі ў Маскву [3, арк. 9–10].

На пасяджэнні Себежскага павятовага выканкама 7 красавіка 1924 г. Малашонак зрабіў даклад аб працы Беларуска-Пскоўскай пагаджальнай камісіі. Ён акцэнтаваў увагу прысутных на тое, што пагаджальная камісія не прыйшла да кансенсусу падчас вызначэння дзяржаўнай мяжы для Себежскага павета, а таму дадзенае пытанне было перададзена на разгляд арбітражнай камісіі ў Маскву. Пасля яго выступу член Себежскага павятовага выканкама Смірноў заявіў, што Асвейскую воласць неабходна любым чынам далучыць да Себежскага павета [3, арк. 9 адв.]. Ён матываваў гэта наступным: па-першае, пры выдачы віз на права ўезду і выезду ў 15-ці вёрстную памежную паласу з Латвійскай Рэспублікай назіралася пэўнае прыцягненне насельніцтва Асвейскай воласці да Себежа; па-другое, для правільнай пастаноўкі аховы мяжы і барацьбы з кантрабандай, а таксама спынення вывазу сыравіны з паўднёва-ўсходняй часткі Себежскага павета неабходна Асвейскую воласць далучыць да павета. Пасля абмеркавання дакладу Малашонка Себежскі павятовы выканкам прыняў пастанову даручыць камісіі адстойваць існуючыя межы, матывуючы гэта з аднаго боку эканамічным прыцягненнем насельніцтва да г. Себежа, а з іншага боку – перавагай вялікарускага насельніцтва [3, арк. 9].

Арбітражны разбор па спрэчцы аб вызначэнні дзяржаўнай мяжы паміж БССР і РСФСР на полацка-себежскім участку адбыўся 26 красавіка 1924 г. у Маскве. Інтарэсы БССР на ім адстойвалі М. Мароз і Л. Праферансаў, пскоўскі бок прадастаўляў Капнін. Пасля дэталёвага вывучэння дадзенага пытання арбітр – А. Белабародаў, пагадзіўся на перадачу Полацкаму павету БССР Асвейскай узбуйненнай і былой Юхавіцкай валасцей. Дадзенае рашэнне было прынята ў сувязі з наступным: па-першае, спрэчная тэрыторыя да 1923 г. уваходзіла ў склад Дрысенскага павета, у якім, згодза з перапісамі, заўжды пераважала беларускае насельніцтва; па-другое, спрэчную тэрыторыю перасякаюць рэкі, якія ўпадаюць у Заходнюю Дзвіну, і лес па іх сплаўляўся на тэрыторыю БССР; па-трэцяе, сельская гаспадарка спрэчнага раёна адрозніваецца ад ільнаводчага Себежа [4, арк. 26.].

Праз два дні на пасяджэнні Віцебскай пагаджальнай камісіі Л. Праферансаў азнаёміў прысутных з рашэннем арбітра аб перадачы спрэчных тэрыторый у склад БССР. Пасля даклада Полацкаму павятоваму выканкаму было даручана ўтварыць пагаджальную павятовую камісію і прыступіць да правядзення дзяржаўнай мяжы па карце адміністрацыйнага дзялення Віцебскай губерні за 1920 г. [5, арк. 20].

Полацка-Себежская павятовая пагаджальная камісія 5 мая 1924 г. вызначала дзяржаўную мяжу паміж Себежскім паветам РСФСР і Полацкім паветам БССР. Яна пачыналася ад мяжы з Латвіяй, потым ішла каля вёсак Макеенкі, Ганжынава, Байдзікава, Узбор'е, Горы, Загноі, Юзафова, Барнуха, Царкона, Ерамеева, Томсіна, Чарцёж, Мылінка, Прудок Себежскага павета, а з боку БССР каля вёсак Стальмакі, Васілеўшчына, Пагулянка, Катрынова, Прудзішча, фальварак Дзенісенкі, Валясы, Рудня, Ваўненкі, Беразнякі, Стайкі, Слаўная, Гарэлкі, Цясны, Арэхаў [5, арк. 2].

Такім чынам, ужо першае пасяджэнне пагаджальнай камісіі выявіла сур'ёзныя разыходжанні паміж яе членамі. Нягледзячы на дэкрэт УЦВК ад 3 сакавіка 1924 г., які прадугледжваў перадачу БССР беларускіх тэрыторый па межах старога (да раянавання 1923 г.) адміністрацыйнага дзялення, прадстаўнікі Пскоўскага губвыканкама заявілі аб неабходнасці перадачы ў склад РСФСР Себежскага паветаў у пашыраных межах, устаноўленых у выніку раянавання 1923 г. У выніку працяглых абмеркаванняў бакі так і не прыйшлі да кансенсусу адносна фарміравання дзяржаўнай мяжы на полацка-себежскім участку і гэта пытанне было перададзена ў арбітражную камісію, якая ў выніку падтрымала беларускі бок.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 346.
2. НАРБ. – Ф. 31. Воп. 1. Спр. 23/5.
3. Дзяржаўны архіў Пскоўскай вобласці. – Ф. р-590. Воп. 1. Спр. 1548.
4. НАРБ. – Ф. 31. Воп. 2. Спр. 2.
5. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку – Ф. 51. Воп. 1. Спр. 178.

**FORMATION OF STATE BORDER OF THE BSSR ON THE POLOTSK-SEBEZH SECTION (APRIL – MAY 1924)**

A. BARANOVSKY

*The article based of archival materials describes the process of formation of state border of the BSSR on the Polotsk-Sebezh section.*
***Key words:*** *the north-eastern state border of the BSSR, Vitebsk Province, Pskov Province, Polotsk uezd, Sebezh uezds.*

УДК 271.22 (476.6)

## ВЗАИМООТНОШЕНИЯ ГОСУДАРСТВА И ПРАВОСЛАВНОЙ ЦЕРКВИ В 1958–1965 гг. (ПО МАТЕРИАЛАМ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ)

**Болтрушевич Н.Г.**
Республика Беларусь, Витебск

*Положение Русской православной церкви в СССР в различные исторические периоды не было однозначным. На примере Витебской области БССР рассматриваются основные изменения политики советской власти в отношении Русской православной церкви в 1958 – 1965 гг., обозначен ряд тенденций государственно-церковных отношений. Исследование построено на использовании широкого спектра источников Национального архива Республики Беларуси, Государственного архива Витебской области и научных публикаций, что позволило сформулировать выводы о развитии взаимоотношений Русской православной церкви и советского государства в данный исторический период.*
***Ключевые слова:*** *Русская православная церковь, Совет по делам Русской православной церкви при СМ СССР, государственно-церковная политика*

PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ: ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А.І. Корсак;
канд. гіст. навук В.У. Чараўко;
канд. гіст. навук, дац. У.Я. Аўсейчыка

Наваполацк
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
2021

PolotskSU

УДК 343.13(063)
ББК 67.410.2я431

Рэкамендаваны да выдання саветам гуманітарнага факультэта
Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 3 ад 29.03.2021)

*Рэдакцыйная калегія:*

*А.І. Корсак,* канд. гіст. навук, дац. (адк. рэд.), заг. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*В.У. Чараўко,* канд. гіст. навук, дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*У.Я. Аўсейчык,* канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Рэцэнзенты:*

*С.В. Кулінок,* канд. гіст. навук, заг. аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь;
*Т.А. Джумантаева,* канд. культуралогіі, дац., дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў :** зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – 272 с.
ISBN 978-985-531-737-2.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы V міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў”. Прадстаўлены вынікі антрапалагічных і археалагічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, археолагаў, этнолагаў, антраполагаў, мастацтвазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, краязнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 343.13(063)**
**ББК 67.410.2я431**

**ISBN 978-985-531-737-2**

© Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2021

PolotskSU

*Навуковае выданне*

**БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:**
**ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ**
**І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Адказны рэдактар *А. І. Корсак*

Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка
*І. М. Чапкевіч*
Дызайн вокладкі *М. С. Мухаморавай*

---

Падпісана да друку 20.05.2021. Фармат 60×84 $^1/_8$. Бумага афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 31,63. Улік.-выд. арк. 32,96. Тыраж 70 экз. Заказ 810.

---

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вырабніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 08.05.2014.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.